# РЫБАЦКІЯ КАРАЦЕЛЬКІ

Прысвячаецца беларускім рыбаловам



**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ:** **1.** На тое шчупак, каб ... не драмалі *(прык.)*. **4.** ... — як рыбалка: не клюе — змотвай вудачкі *(прык.)*. **7.** Марское парусное судна XVIII—XIX ст. **10.** Буйная сібірская рака. **11.** На бязрыб'і і ... — паклёўка *(прык.)*. **12.** Для рыбы і госця адзін закон: праз ... дні пратухаюць *(прык.)*. **13.** Тое, што і пояс. **15.** Цвёрды мінерал. **16.** Задняя частка лодкі, судна. **18.** Назва буйной рыбаводчай гаспадаркі, якая знаходзіцца ў Чэрвеньскім раёне. **19.** Калючы ёрш, але ... з яго смачная *(прык.)*. **21.** Возера ў Паўночнай Афрыцы. **22.** Хвойнае вечназялёнае дрэва. **24.** «Мне пашанцавала. Як мне пашанцавала! // Нацягвалася ..., як струна, // І балярынай рыбка танцавала». З верша Х. Гурыновіча «Рыбацкае». **25.** ..., ці Вох. Маленькі барадаты чалавечак, які, паводле павер'яў, жыве пад зямлёй і дапамагае ўсім, хто трапіў у бяду. **26.** «Развязан ... . // Тут гоман, смех, // І рыбу вытраслі на снег». З паэмы Я. Коласа «Новая зямля». **27.** Моцнае імкненне да чаго-небудзь *(разм.)*. **28.** Рыба — вада, ягада — трава, а хлеб — усяму ... *(прык.)*.

**ПА ВЕРТЫКАЛІ:** **2.** Нагляд за выкананнем правіл рыбалоўства. **3.** Тое, што і бой *(устар.)*. **5.** Лясны жаваранак. **6.** Усходні вецер. **8.** Дзе шчупака няма, там карась ... (прык.). **9.** ... ў рацэ, ды не ў руцэ *(прык.)*. **13.** Рыбаку дождж не ... (прык.). **14.** Калі свежы ..., дык і рыба на кручок *(прык.)*. **17.** Рыба і ... завядуць у старцы *(прык.)*. **20.** Зваранай рыбе ... не патрэбна *(прык.)*. **23.** На бязрыб'е і апалонік ... *(прык.)*. **24.** Ваўка ў плуг, а ён у ... *(прык.)*.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,**
*г. Дзяржынск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**

**Па гарызанталі:** 1. Карасі. 4. Любоў. 7. Брыг. 10. Об. 11. Чарка. 12. Тры. 13. Пас. 15. Агат. 16. Карма. 18. «Волма». 19. Юшка. 21. Чад. 22. Ціс. 24. Лёска. 25. Ох. 26. Куль. 27. Смага. 28. Галава.

**Па вертыкалі:** 2. Рыбнагляд. 3. Сеча. 5. Юла. 6. Ост. 8. Гаспадар. 9. Рыбка. 13. Перашкода. 14. Чарвячок. 17. Зайцы. 20. Вада. 23. Сом. 24. Луг.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.51 | 21.38 | 16.47 |
| Віцебск — | 4.33 | 21.36 | 17.03 |
| Магілёў — | 4.41 | 21.28 | 16.47 |
| Гомель — | 4.47 | 21.16 | 16.29 |
| Гродна — | 5.08 | 21.52 | 16.44 |
| Брэст — | 5.17 | 21.44 | 16.27 |

## Месяц

*Поўня 5 ліпеня.*
*Месяц у сузор'і Рыб.*

## Імяніны

*Пр. Іааны, Марціна.*
*К. Амелії, Антона, Віталя, Філіпа.*



Фота Соф'і КУСЯНКОВАЙ.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

Перад вяселлем:
ЁН: Ура! Нарэшце!!! Я ўжо дачакацца не мог!!!
ЯНА: Можа, мне сысці?
ЁН: Не, нават не думай пра гэта!
ЯНА: Ты мяне кахаеш?
ЁН: Вядома!
ЯНА: Ты мне калі-небудзь здраджваў?
ЁН: Не, як табе такое ў галаву прыйшло?
ЯНА: Будзеш мяне цалаваць?
ЁН: Буду!
ЯНА: Будзеш мяне біць?
ЁН: Ні ў якім разе!
ЯНА: Магу табе верыць?
Пасля вяселля: чытаць знізу ўверх.




## Даты | Падзеі | Людзі

### 10 ЛІПЕНЯ




**1795** год — нарадзіўся (Віленскі павет) Пётр Славінскі — расійскі астраном, педагог, член-карэспандэнт Пецярбургскай АН, доктар філасофіі, прафесар.

**1900** год — нарадзіўся Пётр Аляксандравіч Сергіевіч, беларускі жывапісец і графік, мастак-манументаліст, заслужаны дзеяч мастацтваў Літвы.

**1910** год — нарадзіўся Сяргей Паўлавіч Астравумаў, акцёр, рэжысёр, заслужаны дзеяч культуры Беларусі.

**1940** год — нарадзіўся Ігар Іванавіч Забянькоў, беларускі вучоны ў галіне радыётэхнікі, доктар тэхнічных навук, прафесар.

**1945** год — нарадзілася Раіса Іванаўна Сергіенка, беларускі музыказнавец, доктар мастацтвазнаўства, прафесар.

**1950** год — нарадзіўся Уладзімір Міхайлавіч Круглік, беларускі вучоны ў галіне аўтатрактарнага машынабудавання, доктар тэхнічных навук, прафесар.



**1980** год — у Мінску заснаваны Літаратурны музей Петруся Броўкі.

**2000** год — у Мінску адкрыты мемарыял у памяць ахвяр Халакосту на месцы, дзе ў сакавіку 1942 года было расстраляна каля 5 тысяч чалавек. Аўтар праекта — архітэктар Леанід Левін.






**1765** год — нарадзіўся Пётр Іванавіч Баграціён, рускі генерал ад інфантэрыі, герой вайны 1812 года. Смяротна паранены ў Барадзінскай бітве.

**1835** год — нарадзіўся Генрык Вяняўскі, польскі скрыпач і кампазітар, адзін з найбуйнейшых скрыпачоў XIX стагоддзя, прадстаўнік рамантычнага кірунку.

**1890** год — нарадзілася Вера Міхайлаўна Інбер, руская паэтэса. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

**1895** год — нарадзіўся Карл Орф, нямецкі кампазітар, педагог і дырыжор.

**1905** год — нарадзіўся Леў Абрамавіч Касіль, расійскі пісьменнік. Адзін з пачынальнікаў савецкай дзіцячай літаратуры, член-карэспандэнт АПН СССР.

**1940** год — выйшаў указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР «Аб адказнасці за выпуск недабраякаснай або некамплектнай прадукцыі і за невыкананне абавязковых стандартаў прамысловымі прадпрыемствамі».

**1945** год — з Берліна на радзіму адправіўся першы цягнік з дэмабілізаванымі воінамі Чырвонай Арміі, удзельнікамі штурму нямецкай сталіцы.

Так гаварыў...

**АЛЯКСАНДР БЛОК:**

*«Толькі закаханы мае права на званне чалавека».*


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы
тэл./факс: 287 17 79,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2235.

Нумар падпісаны ў 19.30 9 ліпеня 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12